Надзея ПАРЧУК, г. Брэст

***

*Ну хто сказаў, што рай не на зямлі,*
*Што тут яго не можа быць ніколі –*
*Бо вы яшчэ не ўсе куткі прайшлі*
*І нават летам не бывалі ў полі.*

*Наўрад ці вы брадзілі па лугах,*
*Дзе травы ў кветках росамі*
*іскрацца,*
*А птаства колькі водзіцца ў лясах,*
*Спявае там, не можа наспявацца!*

*Улетку скрозь – жывое хараство:*
*І жыта спее, і лянок сінее...*
*Зямлі і неба вечнае радство –*
*Так паяднаць адзін Гасподзь умее.*

*Ну хто сказаў, што рай не на зямлі?!*
*Яго патрэбна толькі ўмець убачыць.*
*Каб у душы ўсе струны ажылі,*
*Спяшайся ў сэрцы думкі перайначыць.*